***Энгельс Дарашэвіч***

# ГЛАБАЛЬНАЯ ПРАБЛЕМА АЎТЭНТЫЧНАСЦІ

*Артыкул прысвечаны месцу аўтэнтычных форм культуры ў працэсах ідэнтыфікацыі і самаідэнтыфікацыі асобы і этнасу на пераломным этапе пераходу ад індустрыяльнай глабалізацыі да прынцыпова новых культурна-сацыяльных фармацый «грамадства трэцяй хвалі».*

***Engels Darashevich***

# THE GLOBAL PROBLEM OF AUTHENTICITY

*The article is dedicated to the place of the authentic forms of culture in the processes of identification and identity of the person and the ethnic group at a critical stage of transition from the industrial globalization to fundamentally new cultural and social formations ofthe "third wave" society.*

Цягам апошніх дзесяцігоддзяў у сферы антрапалогіі, асабліва так званай культурнай (ці сацыякультурнай) антрапалогіі з’явілася шмат публікацый, якія датычаць аўтэнтыкі (альбо аўтэнтычнасці), ідэнтыфікацыі, сама- і этнаідэнтыфікацыі. Пры гэтым некаторыя з іх пераадольваюць межы гуманітарных навук, і не толькі самапаспяхова выкарыстоўваюць метады навук дакладных, але і прапануюць ужыванне сваіх тэарэтычных напрацовак і канцэпцый у сферы сацыяльнай практыкі.

У чым, на мой погляд, сутнаць аўтэнтыкі, аўтэнтычнасці, ідэнтыфікацыі і іх этнакультурнага кантэксту? У перакладзе са старажытнагрэчаскай мовы:α ὐθεντικός [authentikos] – гэта «рэальны», «сапраўдны» [2]. Тамупры пошуку аўтэнтычнасці, ідэнтыфікацыі (англ. authenticity)– шукаюць сапраўднасць[6], імкнуцца наблізіцца як мага бліжэй да аб’ектаў і ўявіць іх сапраўдныя сутнасць, існасць і паходжанне, гістарычную і культурную праўдзівасць і каштоўнасць.

Добра разумеючы адноснасць і шматзначнасць вызначэнняў аўтэнтычнасці і ідэнтыфікацыі, трэба зазначыць, што, нягледзячы на, магчыма, аб’ектыўную адсутнасць абсалютна адназначных вызначэнняў, як правіла, большасць гуманітарыяў і творчых асоб (этнолагаў, мастакоў, фалькларыстаў і г.д.), а апошнім часам – і спецыялістаў па штучным інтэлекцеі камп’ютарных тэхналогіях, – на ўзроўні творчых інтуіцый разумеюць значнасць праблемы ўяўлення і ўвасаблення аўтэнтычных з’яў і аб’ектаў. Чым больш шырокі кругагляд у людзей, – тым больш імкліва яны імкнуцца да аўтэнтычнасці: гэта і спробы адрадзіць даўнія з’явы і каштоўнасці (асабліва ў эстэтычнай сферы: фальклор, гістарычна зніклыя формы паводзін, артэфакты, стылі выканання– нават у акадэмічным класічным мастацтве), і авалодаць якаснымі (аўтэнтычнымі) стравамі, напоямі, прадметамі побыту і інтэр’еру, тэхнікамі ўдасканалення цела і свядомасці, танцамі, праграмным забеспячэннем для камп’ютара і г.д.



Малюнак 1 – Элвін Тофлер, 2006







Малюнак 2 – Вокладкі выданняў Тофлера, 1970 – 2010

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Як гэта зрабіць»? – гэта асобная праблема, а ў гэтым артыкуле варта засяродзіцца на этыялагічным аспекце з'явы: «Чаму аўтэнтычнасць стала ў сучасным глабалізаваным Сусвеце нагэтулькі актуальная»? Здаецца, адказ вельмі просты: хуткасць змен ў жыцці і культуры міленіуму, якая вымагае пошуку стабільнасці (нават часам штучнай, «дызайнерскай»); небяспека этнічнага самазабыцця;масаваеспажыванне сурагатаў усіх кшталтаў (ад гастранамічных да мастацкіх), якія ўжо істотна ўсім надакучылі і г.д. Аўтэнтыка і ідэнтыфікацыя– неабходнасць у сучасным звыш-тэхнагенным і інфарматызаваным«грамадстве спажывання». Першымі звярнулі ўвагу на гэта напрыканцы ХХ стагоддзя некаторыя ўплывовыя футуролагі і сацыёлагі. У творах аднаго з іх, Элвіна Тофлера (мал. 1), – «Футуршок», «Трэцяя хваля» (мал. 2) –выкладзена тэорыя, адпаведна якой галоўным прыёмам у стабілізацыі сучаснага тэхнагеннага, але неўтаймаванага грамадства з'яўляецца зварот да мінулых культурных феноменаў (этнічна афарбаваных даўніх звычаяў іграмадскіх нормаў, руральнай эстэтыкіі дызайну і г.д.), да фальклору, традыцыйна-побытавых з'яў інатуральнай экалогіі прыроднага атачэння. Прычым, пад сваю (магчыма, утапічную на першы погляд) тэорыю даследчык падводзіць добры матэрыялістычны фундамент у выглядзе канстатацыі чарговай замены асноўных энергітычныхкрыніц, якая ў хуткім часе зноў чакае чалавецтва.

У кнізе «Трэцяя хваля» Тофлер вылучае тры асноўныя стадыі (хвалі) развіцця чалавецтва: аграрную, індустрыяльную, постіндустрыяльную. Хваля у Тофлера – гэта рывок у навуцы і тэхніцы, які прыводзіць да глыбінных зрухаў у жыцці грамадства. Такім рыўком для першай хвалі стала ўкараненне сельскай гаспадаркі, для другой – прамысловы пераварот. Хваля «пракатваецца» паступова, і звычайна аднačасова на планеце існуюць усе тры стадыі (але адна – дамінуе). Па меры паскарэння тэмпу жыцця чалавецтва перыяды паміж хвалямі паступова скарачаюцца: тысячагоддзі– для першай хвалі, 300 гадоў – для другой. Трэцяя хваля, па ацэнцы Тофлера, цалкам зменіць другую да 2025 года [4]. Такім чынам, чалавецтва зараз знаходзіцца на чарговым пераломным моманце гісторыі. Хутка скончыцца нафтавая і газавая «ліхаманка», бязлітасны гвалт над прыродай (якую і ў індустрыяльных грамадствах другой хвалі вынішчалі і вынішчаюць неаднавіма, катастрафічна). Асноўнымі крыніцамі энергіі будуць сонца, вецер, вада, геатэрмальная энергія. Крыніцы энергіі будуць аднаўляць без катастрафічных пашкоджанняў для прыроды, і гэтых крыніц будзе шмат. Крыніцы будуць празрыста і справядліва размеркаваныя, і будуць мець вялікую экалагічнасць. Глабальныя патрэбы чалавецтва з масавага ненасытнага спажывання будуць пераарыентаваны на штучныя і эксклюзіўныя рэчы і каштоўнасці, некалі характэрныя для лакальных традыцыйных культур. Таму зараз, напачатку ХХІ стагоддзя, – традыцыйныя каштоўнасці, аўтэнтычныя складнікі лакальных культур чалавецтва НЕЛЬГА страціць.Іх абавязкова варта вывучыць, каталагізаваць і ўзяць пад ахову, пакуль індустрыяльны вір у апошнім сваім «цунамі» не вынішчыў іх. Гэта не метафара: пачатак міленіўму з тэрарыстычнымі вылазкамі ісламістаў і гульнямі некаторых еўрапейскіх дзікуноў ХХІ стагоддзя з ядзернай «сякерай» – сведчанне таго, што агрэсіўна-індустрыяльны светапогляд «так проста» не здаецца.



Малюнак 3 – Рэгіна Гамзовіч на рэгіянальнай імпрэзе ў Лепелі, 2014 (фота Аляксандра Ждановіча)




Малюнак 4 – Праграмнае даследаванне Зінаіды Мажэйкі па экалогіі фальклору, 2011



Малюнак 5 – Партрэт Зінаіды Мажэйкі, напісаны мастаком і ўдзельнікам фальклорнага руху Ягорам Арцюховым, 2016

Гэтыя прынцыповыя тэзы з энтузіязмам віталітэарэтыкі і практыкікультуры і мастацтва, многія лідары-аналітыкіў галінахкамп'ютарнай тэхнікі і ІТ-тэхналогій. Асабліва – функцыянеры і эксперты ў галіне розных напрамкаў экалогіі, экалогіі культурыі культурнай антрапалогіі. Менавіта так з'явіліся спісы нематэрыяльнай спадчыны чалавецтва, у якіх апынуліся з'явы недвухсэнсоўна знітаваныя з «каранёвай» для чалавецтвааўтэнтыкай і ідэнтыфікацыяй: этнічнае мастацтва, эксклюзіўныя элементы традыцыйнай паводзіннай культуры, якія перадаюцца вусным шляхам і свядома захоўваюцца супольнасцямі. Пры складанніінвентароў спадчыны, дарэчы, высветлілася, што звычайная этнаграфія (якая мае пераважна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фармальна-апісальныя прыярытэты) і блізкія да яе лакальныя напрамкі народазнаўства (мастацтвазнаўства, музыказнаўства, філалогія) ужо не зусім рэлевантныя для аналізу і вырашэння складаных праблем, «надыктаваных» пераходам вядучых і блізкіх да іх краін Сусвету ад індустрыяльнай (нават часткова постіндустрыяльнай) глабалізацыі да прынцыпова новых культурна-сацыяльных фармацый «грамадства трэцяй хвалі» па тэрміналогіі Тофлера.

У Беларусі найбольш «сенсітыўныя» і «паглыбленыя ў аўтэнтыку» даследчыкі напрыканцы XX стагоддзя адчулі іаб’ектыўную неабходнасць «звароту да каранёў», і абмежаванасць «вузкадысцыплінарнага» падыходу да этнакультуры. Пра гэта неаднаразова пісалі, напрыклад, філосафы Уладзімір Конан і Мікола Крукоўскі, якія мелі шмат сяброў і аднадумцаў у асяродку спецыялістаў па фальклоры. Дзякуючы інтуіцыі і пасіянарным намаганнямайчыннай народазнаўчай навуковай супольнасці, беларусы маюць, напрыклад, раскошныя нізкі гратэскна-эпічных антрапалагічных фільмаў Зінаіды Мажэйкі (мал. 5), якая пачынала як этнамузыколаг, і дакументальна-навелістычных фільмаў Рэгіны Гамзовіч (мал. 3), якая пачынала як журналіст. Сінхронна-рэгіянальны кампаратыўны «зрэз» аўтэнтычнага фальклорукраіны міленіўму занатаваны ў шматтомным фальклорным зборы «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (мал. 6), аўтарскі калектыў якога начале з вучаніцай Мажэйкі Тамарай Варфаламеевай, філолагам Аленай Боганевай і этнахарэолагам Міколам Козенкам атрымаў за сваю працу спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (мал. 7).

Як бачым, маючы пастаянны непасэдны кантакт з носьбітамі традыцыі «прасунутыя» даследчыкі не збіраліся спыняцца на даследаванні нейкай адной яе плоскасці, а імкнуліся занатаваць «шматканальны» аўдыявізуальны злепак з антрапалагічных аўтэнтычных культурных тыпаўБеларусі:іх двухмерную падрабязную копію ў відэафайлах ці кампаратыўнае шматбаковае апісанне ў грунтоўным фальклорным зборы. Але апісанне і фіксацыя аўтэнтычнага фальклоруне сталася іх навуковай «столлю». Зінаіда Мажэйка не прыпыняла сваю акадэмічную кар’еру, пакуль не прысвяціла сваёй «адвечнай любові» – аўтэнтычным спеўным і спеўна-інструментальным субкультурам Беларусі – грунтоўную манаграфію па іх экалогіі (мал. 4).Такім чынам, яна не абмежавалася дакументаваннем аўтэнтыкі і ідэнтычнасці носьбітаў традыцыйнай культуры сваёй Радзімы, але дбала пра іх будучыню, клапацілася пра яе, аналізуючы механізмы захавання і аховы фальклору. І такі падыход да фальклору – відавочна міждысцыплінарны і сацыякультурна-антрапалагічны. Рэгіна Гамзовіч – дагэтуль пастаянны ўдзельнік абмеркаванняў і зацвярджэнняў элементаў спісу нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі, кансультант і дарадца носьбітаў і захавальнікаў яе лакальных аўтэнтычных фальклорных традыцый. Мікола Козенка – аўтар ідэі і мастацкі кіраўнік 15-гадовага фестывальнага праекту этнакультурнага выхавання«Берагіня», які сёння па міжнародных стандартах варта рэгістраваць у сусветным інвентары спадчыны як сістэмную нацыянальную школу традыцыйнага мастацтва.




Малюнак 6 – Том збору «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў», 2010



Малюнак 7 – Алена Боганева, Тамара Варфаламеева і Мікола Козенка на ўручэнні ўзнагарод за збор «ТМКБ», 2015


Краязнаўчая
Стагоддзі беларускай культуры
Мара спраўдзілася!

Малюнак 8 – Артыкул выпускнікоў БДУКМ павыніках іх этнамастацкай адукацыі, 2016 [1]

Сінтэз дакладных навук і практычнага напрамку фалькларыстыкі, які ўзмацніўся ў міленіўм, востра патрабуе інтэнсіўнага развіцця і прымянення новых галін ведаў, новых інфармацыйных тэхналогій, яднання палітычных, экалагічных і культура-творчых інтэнцыйразвіцця грамадства для аховы яго каранёвай культуры і, нават, самога яе існавання. Ад дакладнасцімадэлявання паспяховай стратэгіі забеспячэння аўтэнтычнасці і ідэнтыфікацыі лакальных культур у XXI стагоддзі залежыць захаванне этнасаў, дзяржаў, чалавецтва і, ўрэшце рэшт, самой Зямлі. Захаванне этнасаў і іх лакальных аўтэнтычных культур мае, магчыма, яшчэ большае значэнне для жыцця на планеце, чым захаванне асобных відаўфлоры і фаўны. Этнасы і іх культура ў стабільным стане ствараюць ўстойлівую агульна-глабальную сістэму асваення прыроднага ландшафту, мацуюць падтрымку існавання гарманічнага адзінства чалавецтва. Дарэчы, іх існаванне ў жыццяздольным

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

стане – адна з галоўных умоў прадухілення сусветных гуманітарных катастроф. Рэаліі сучаснай Беларусі дэманструюць нам, што з'явы, якія прадчувалі англамоўныя футуролагі і айчынныя філосафы ў галіне*агульнага вектара прагі аўтэнтычнасці* чалавецтвам напрыканцы XX стагоддзя, сёння маюць і «натуральныя» (падмацаваныя намаганнямі грамадскіх рухаўі суполак),і «лабараторныя» (эксперыментальна створаныя вучнямі і паслядоўнікамі навукоўцаў) прыклады, у тым ліку, і ў Беларусі.

Безумоўна, сінхронны аналіз самаідэнтыфікацыі і прагі да аўтэнтычнасці этнасу, народу, нацыі – асобныя, вельмі складаныя тэмы, яны патрабуюць глыбокага агляду. Таму мы засяродзімся на тэзісным разглядзе ідэнтыфікацыі і аўтэнтычнасці ў рэчышчызадач аховы фальклору беларусаў.Адной з вельмі цікавых спроб адраджэння лакальнай народнай культуры (у напрамку самаідэнтыфікацыі і аўтэнтычнасці) сёння з'яўляецца дзейнасць заходнепалескай групы энтузіястаў фальклору і народнага побыту [3]. Фестывалі традыцыйнай культуры і мастацтва вуснай традыцыі «Фальклор без межаў», «Мотальскія прысмакі», «Радавод», – падтрыманы грамадствам і трывала прапісаны на берасцейскай зямлі. Яны – прыклад «рэгіянальнай ініцыятывы», своеасаблівага «навуковага інсіту» (па выразу прафесара Аляксея Рагулі),якія атрымліваюцьагульнанацыянальны рэзананс і вырашаюць многія праблемы аўтэнтычнасці і ідэнтыфікацыі мясцовых жыхароў на фоне масавага этна- і нацыянальнага нігілізму, глабалістычна-індустрыяльнай абыякавасці да самапазнання і самаразумення асобы.

Прыкладам паспяховай формы«лабараторнага» фарміраванняаўтэнтычнасці і ідэнтыфікацыі маладых беларусаў з'яўляюцца дасягненні кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ па падрыхтоўцы фалькларыстаў-практыкаў. Адукацыйная мадэль кафедры, канцэптуальна пабудаваная на методыках дэманстратыўнай антрапатэхнікі і «курса майстра», узмоцненая метадам уключанага назірання і веданнем сучасных тэхналогій, фарміруе,па меркаваннях саміх выпускнікоў (мал. 8), абсалютна дакладную самаідэнтыфікацыю і беспамылковае адчуванне прыкметаў аўтэнтычнасці каранёвай культуры свайго народа [1].

Межы артыкула не дазваляюць канкрэтызаваць усе магчымыя падыходы да паняцця «аўтэнтыка»і «ідэнтычнасць», розныя іх формы і віды. Хацелася б толькі звярнуць увагу педагогаў і выхавальнікаў, і, перш-наперш,прафесарска-выкладчыцкага складунашага ўніверсітэта на важнасць абмеркавання феноменаў«аўтэнтыка»і «ідэнтычнасць» і паміжсобку, і са студэнцтвам. Універсітэт культуры і мастацтваў, натуральна, бліжэй за ўсе іншыя навучальныя ўстановы да разумення гэтай актуальнай і сапраўды глабальнай у XXI стагоддзі праблемы. Магчыма– і бліжэй да пошуку шляхоў яе рэальнага вырашэння ў рэчышчы пераадоленнякраінай пераходнага перыяду да новай формы існавання: да грамадства трэцяй хвалі – грамадства з аўтэнтычнай культурай і грамадства дакладна ідэнтыфікаванага.

**Спіс літаратуры:**


1. Асадчая, К. Мара спраўдзілася! / К. Асадчая, П. Кургановіч // Краязнаўчая газета. – 2016. – № 11 (604). – С. 4.
2. Аутентификация [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%90%D1%83%D1%82%D0%B5%D0%BD%D1%82%D0%B8%D1%84%D0%B8%D0%BA%D0%B0%D1%86%D0%B8%D1%8F. – Дата доступу : 07.04.2016.
3. Денисейко, А. Тышковичи – классика полесского фольклора : страницы истории родного края / Анатолий Денисейко, Иван Шпак. – Брест : Альтернатива, 2012. – 216 с.
4. Тоффлер, Э. Предисловие / Элвин Тоффлер // Метаморфозы власти. – М. : АСТ, 2009. – С. 4 – 12.
5. Toffler, Alvin. A Future Shock, 1970 = Тоффлер, Элвин. Шок будущего / пер. на рус. яз. А. Мирер, И. Москвина-Тарханова, В. Кулагина-Ярцева, Л. Бурмистрова, К. Бурмистров, Е. Комарова, А. Микиша, Е. Руднева, Н. Хмелик [Электронная публикация] // Центр гуманитарных технологий. – Дата доступа : 26.01.2011.
6. Lindholm, Charles. Culture and Authenticity / Charles Lindholm. – Australia : Blasitwell Publishing, 2008. – 176 p.



*Вольга Лабачэўская*


**БЕЛАРУСКІ КУТОК У ПАРЫЖЫ:**
**ЭКСПАЗІЦЫЯ БССР НА СУСВЕТНАЙ ВЫСТАЎЦЫ ДЭКАРАТЫЎНАГА МАСТАЦТВА І МАСТАЦКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ 1925 ГОДА**


У артыкуле на аснове матэрыялаў архіўнай справы, якая захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, разгледжаны факт першай у савецкі перыяд рэпрэзентацыі беларускай культуры і мастацтва за мяжой – на Сусветнай выстаўцы дэкаратыўнага мастацтва і мастацкай прамысловасці з Парыжы ў 1925 г.



*Olga Lobachevskaya*


**BELARUSIAN CORNER IN PARIS:**
**BSSR EXPOSITION AT THE WORLD EXHIBITION OF DECORATIVE ARTS AND THE ART INDUSTRY, 1925**


The article, based on archive materials of the case, which is stored in the National Archives of the Republic of Belarus, is considered the first fact in the Soviet period when there was the representation of the Belarusian culture and art abroad - at the World Exhibition of Decorative Arts and the art industry in Paris in 1925.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ